**САВЕТ МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ** | **СОВЕТ МИНИСТРОВ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

**П А С Т А Н О В А** | **ПОСТАНОВЛЕНИЕ**

17 верасня 2011 г. № 1245

**г. Мінск** | **г. Минск**

Аб мерапрыемствах, прысвечаных 100-годдзю
з дня нараджэння Максіма Танка

У мэтах арганізацыі шырокага святкавання ў 2012 годзе 100-годдзя з дня нараджэння выдатнага беларускага паэта Максіма Танка Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Зацвердзіць прыкладзеныя:

план мерапрыемстваў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння Максіма Танка;

склад рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па правядзенню мерапрыемстваў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння Максіма Танка (далей – рэспубліканскі арганізацыйны камітэт).

2. Рэспубліканскаму арганізацыйнаму камітэту сумесна з зацікаўленымі забяспечыць рэалізацыю плана мерапрыемстваў, названага ў абзацы другім пункта 1 дадзенай пастановы.

3. Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, аблвыканкамам, Мінскаму гарвыканкаму аказваць садзейнічанне рэспубліканскаму арганізацыйнаму камітэту ў правядзенні мерапрыемстваў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння Максіма Танка.

4. Фінансаванне арганізацыі і правядзення мерапрыемстваў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння Максіма Танка, ажыццяўляць у межах сродкаў, прадугледжаных дзяржаўным органам у рэспубліканскім і (або) мясцовых бюджэтах на правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў, а таксама за кошт іншых крыніц.

5. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

Прэм’ер-міністр
Рэспублікі Беларусь М.Мясніковіч